# ВАЖНЕЙШЫЯ ПАЛАЖЭННІ СТАТУТАЎ 1529, 1566, 1588 гг.

***Р. М. Мазоль***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Вяршыняй сістэматызатарскай і кадыфікатарскай дзейнасці стала распрацоўка і прынящце вядомых зводаў законаў ВКЛ – статутаў 1529, 1566, 1588 гг. Надрукаваны яны былі не на традыцыйнай лацінскай або

царкоўнаславянскіх мовах, а на мове шырока вядомай народным масам – старабеларускай. Да таго ж базавай асновай статутаў было мясцовае звычаёвае права старажытных беларускіх дзяржаў.

Прынящце Статута 1529 г. выпрацавала новую, да гэтага часу невядомую сістэму заканадаўства, заклаўшы трывалыя падставы далейшага яго развіцця. Галоўнае адрозненне ад падобных заканадаўчых актаў іншых дзяржаў: яго канстытуцыйная накіраванасць і ўласныя падставы кадыфікацыі. Кожны раздзел пабудаваны на дамінаванні норм адной галіны права. У Статуце ўтрымліваліся шматлікія канстытуцыйныя нормы: аб адказнасці кожнага чалавека індывідуальна за ўласныя правапарушэнні; аб падпарадкаванні ўсіх людзей аднолькавым пісаным законам дзяржавы. Замацоўваюцца прынцыпы ўсеагульнасці права, адказнасці кожнага за сваю віну.

У Статуце 1566 г. упершыню праяўляецца тэндэнцыя аддзялення судовай улады ад выканаўчай. Забаранялася выбіраць суддзямі ў земскія суды прадстаўнікоў духавенства і службовых асоб мясцовай адміністрацыі. Улада князя значна абмяжоўвалася соймам, без згоды якога ён не меў права пачынаць вайну, уводзіць новыя падаткі, прымаць новыя законы. Увогуле ў Статуце 1566 г. акрэсліваецца пераход ад феадальнага да буржуазнага права ўласнасці, так як, напрыклад, дазвалялася ўсім феадалам свабодна распараджацца сваёй нерухомай маёмасцю, замацоўвалася права кожнага чалавека свабодна завяшчаць маёмасць. Выключэнне складалі непаўналетнія асобы і псіхічна хворыя.

Адносна крымінальнага права: суб'ектам злачынства прызнаваўся толькі чалавек, упершыню вызначаўся ўзрост крымінальнай адказнасці (з 14 гадоў), а таксама быў зроблены значны крок у замацаванні прынцыпа прэзумпцыі невінаватасці. Забаранялася турэмнае зняволенне прызванага да суда шляхціца, пакуль ён не будзе прызнаны вінаватым у судовым парадку.

Статут 1588 г. змяшчаў у сваім пачатку прывілей Жыгімонта III падканцлеру ВКЛ Сапегу на права друкаваць і выдаваць Статут. Неабходнасць друкавання законаў абгрунтоўвалася тым, што рукапісныя законы ствараюць шкодную разнастайнасць закона і цяжкасць у яго разуменні. У Статуце 1588 г. быў замацаваны прынцып падзелу ўлад: заканадаўчая належала сойму, выканаўчая – вялікаму князю і радзе, судовая – судам. Упершыню рабілася спроба абмежавання атрымання адной асобай некалькіх службовых пасад. Статут замацаваў таксама такія важныя канстытуцыйныя прынцыпы, як суверэнітэт дзяржавы і народа, роўнасць усіх свабодных людзей перад законам, права чалавека на ўласнасць, прынцып верацярпімасці. Нормы Статута замацоўвалі адзін з важнейшых прававых прынцыпаў – прэзумпцыю невінаватасці: пры

ўзнікненні сумненняў суддзяў адносна вінаватасці падсуднага схіляцца да вызвалення яго ад адказнасці.

Статут быў параўнальна гуманным законам, што прасочваецца і ў тых артыкулах, якія прадугледжваюць вызваленне ад пакарання непаўналетніх злачынцаў, псіхічна хворых людзей і тых, хто знаходзіўся ў стане неабходнай абароны. Узрост крымінальнай адказнасці павялічыўся з 14 да 16 гадоў. Забаранялася прысуджаць цяжарную жанчыну да смяротнага пакарання. Шляхціц за забойства простага чалавека мог быць пакараны смерцю, тым самым Статут паклаў пачатак рэалізацыі пастулата аб роўным пакаранні за забойства чалавека.

Многія даследчыкі адзначалі ўжо адносна першага Статута, што такога закону не мела яшчэ феадальная Еўропа. Статут, які падараваў нашай мове афіцыйны статус, зрабіў значны ўплыў на развіццё права суседніх краін. Аб юрыдычнай значнасці яго сведчыць тое, што Статут 1588 г. быў дзеючым законам амаль да паловы XIX ст. Ён меў галоўнай мэтай умацаванне адзінства дзяржавы і яе суверэнітэту.